# МЕДЫЯТЫЗАЦЫЯ НАВУКІ ЯК СРОДАК ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

***Н. Я. Луйгас***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*lujgas_nat@mail.ru*

У артыкуле закранаецца дыскусійная праблема медыятызацыі навукі, разгледжаны станоўчыя і адмоўныя бакі акадэмічнага шляху падрыхтоўкі калектыўных даследаванняў па праблеме гісторыі беларускай сям'і, а таксама зроблена спроба спрагназаваць сродак скарачэння традыцыйнай мадэлі перадачы актуальных ведаў ад даследчыка да студэнта праз выкарыстанне адукацыйных платформ.

***Ключавыя словы:*** навуковы дыскурс; гістарыяграфія; сям'я; медыятызацыя; адукацыйная платформа.

# MEDIATIZATION OF SCIENCE AS A MEANS OF POPULARIZATION OF SCIENTIFIC RESEARCH

***N. E. Luihas***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: N. E. Luihas (lujgas_nat@mail.ru)*

The article covers the meditization of science, considers pros and cons of academic way of research on belarusian family history. Traditional way of research knowledge transfer from researcher to student is predicted to shorten when using online educational platforms.

***Key words:*** scientific discourse; historiography; family; mediatization; educational platforms.

Шматгранны працэс уплыву медыя на розныя бакі жыццядзейнасці грамадства атрымаў назву медыятызацыі. У навуковым дыскурсе, пачынаючы з 1990-х гг., таксама з'явілася шмат спробаў вызначыць сутнасць і кантэнт сучаснай з'явы прадстаўнікамі розных галін навукі [1, с. 2]. Цікавасць да асэнсавання гэтага абсалютна зразумелая. Творчая і навуковая інтэлігенцыя адначасова выступае не толькі ў якасці

карыстальніка-спажыўца, але і ў якасці стваральніка актуальнага кантэнту, які можа хутка дасягнуць да чытацкай аўдыторыі.

Адным з істотных працэсаў, што назіраецца ў гэтым кантэксце, з'яўляецца медыятызацыя навукі, якая выяўляецца, з аднаго боку, у пашырэнні даступнасці навуковых ведаў (напрыклад, праз сістэмы «ResearchGate», «ScienceDirect», «Scopus» і інш.), а з другога боку, у пашырэнні сродкаў іх папулярызацыі (адукацыйныя платформы «Udemy», «Coursera» і інш.).

Навуковыя супрацоўнікі добра ведаюць, што шлях ад этапу вывучэння навуковай тэмы даследчыкам праз падрыхтоўку артыкулаў, іх выданне, абароны дысертацыйнай работы, атрыманне дакументальнага пацвярджэння-прызнання ВАК да трансляцыі новых ведаў студэнтам расцягваецца не на адзін год. Медыятызацыя навукі як хуткаснага канала сувязі даследчыка з зацікаўленай аўдыторыяй дазваляе не толькі падтрымліваць стасункі на ўзроўні донар-рэцэпіент, але і вырашаць задачу папулярызацыі найноўшых дасягненняў у любой галіне навукі, скараціўшы класічны шлях (прыняты ў акадэмічных колах) распаўсюджвання інфармацыі. Разгледзім гэта на прыкладзе класічнага навуковага вывучэння тэмы гісторыі беларускай сям'і і паспрабуем спрагназаваць, якім чынам медыятызацыя навукі дапаможа распаўсюдзіць назапашаныя веды ў студэнцкую аўдыторыю. Дзеля гэтага варта адзначыць прамежак часу, які спатрэбіўся калектыву даследчыкаў для падрыхтоўкі дзвюх абагульняльных прац, а таксама прааналізаваць навуковыя дапаўненні, што адрозніваюць гэтыя выданні.

Пачатак трэцяга тысячагоддзя ў гісторыі беларускай этналогіі адметны выхадам у свет грунтоўнай працы па праблеме сям'і калектыву аўтараў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі. Варта падкрэсліць, што два спецыялізаваныя выданні – «Сям'я і сямейны быт беларусаў» (1990 г.) і 5 том «Сям'я» серыі «Беларусы» (2001 г.) – найбольш поўныя падагульняльныя даследаванні ў гісторыі этналагічнай навукі. Такім чынам, 11 гадоў спатрэбілася для таго, каб пашырыць і паглыбіць напрацаваныя веды па гэтай тэме.

Чым прынцыпова адрозніваюцца гэтыя калектыўныя працы? Калі ў першым храналагічныя рамкі ахопліваюць перыяд ад часу фарміравання беларускай народнасці да 80-х гг. XX ст. [3], то ў другім яны ўключаюць перыяд ад эпохі Старажытнай Русі да канца XX ст. [4].

Гісторыя беларускай сям'і на працягу трох сацыяльна-эканамічных фармацый упершыню была прадстаўлена ў калектыўнай манаграфіі «Сям'я і сямейны быт беларусаў» [3]. В. К. Бандарчык зноў вярнуўся

да гістарыяграфіі вывучэння прадмета польскімі, рускімі і беларускімі даследчыкамі. Канцэптуальны стрыжань адбору прац заснаваны на сацыяльна-палітычнай гісторыі ўваходжання беларускіх земляў у склад Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі, пазней – Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, што прадвызначыла неабходнасць аналізу першакрыніц не толькі па прынцыпе тэмы і месца іх выдання, але і з улікам уплыву палітычнага фактару. В. К. Бандарчык вызначыў асноўнае кола першакрыніц, сцісла ахарактарызаваў стрыжнёвыя праблемы даследаваняў па тэме, адзначыў эвалюцыю гістарычных школ і напрамкаў у развіцці этналагічнай думкі XIX–XX стст., прадстаўнікі якіх звярталіся да вывучэння розных аспектаў беларускай сям'і [3, с. 3–14].

Г. М. Курыловіч выявіла бытаванне дзвюх формаў сям'і, вызначыўшы тэндэнцыю падзелу вялікіх сям'яў на малыя, прадставіла тыпалогію сямейнай арганізацыі на падставе сваяцкага складу, дынаміку структуры колькаснага складу. Багацейшы ў параўнанні з папярэднім гістарычным этапам факталагічны матэрыял па пытаннях унутрысямейных адносін, шлюбу, побыту дзяцей узяты з этнаграфічных, літаратурных, мемуарных крыніцаў двух стагоддзяў. Падзел вялікіх сем'яў, адыходніцтва, п'янства вылучаны даследчыцай у якасці актуальных праблем сям'і эпохі капіталізму. Значная ўвага тут надаецца праблеме шлюбу. Аўтар прасачыла гістарычную дынаміку зменаў шлюбнага ўзросту, закранула пытанні стабільнасці шлюбу, прааналізавала розніцу ва ўзросце сужэнцаў з мэтай выяўлення няроўных шлюбаў і часу іх існавання, прычыны сямейных разладаў і разводаў [3, с. 43–124].

Шлюб і сям'я гараджан канца XIX–пачатку XX стст., а таксама характарыстыка сучаснай гарадской сям'і прадстаўленыя Л.В.Ракавай [3, с. 125–188]. Тут разгледжаны этнадэмаграфічныя аспекты праблемы шлюбу, структура і функцыі сям'і, асаблівасці фарміравання шлюбаў у гарадах БССР, закрануты пытанні стабільнасці шлюбаў, тыпы, структура і функцыі сучаснай гарадской сям'і і інш. Трэба адзначыць, што гэты раздзел манаграфіі найбольш насычаны этнасацыялагічнымі даследаваннямі, што дазваляе наглядна праілюстраваць дакладнасць зробленых Л. В. Ракавай высноў.

Апошні раздзел манаграфіі прысвечаны вывучэнню традыцыйнай і сучаснай сямейнай абраднасці беларусаў. На падставе архіўных матэрыялаў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі і палявых матэрыялаў экспедыцый, этнаграфічных прац канца XIX–пачатку XX стст. Т. І. Кухаронак разгледзела комплекс традыцыйных радзінных, вясельных, пахавальных звычаяў і абрадаў па цыклах [3, с. 189–249].

Паасобны аналіз сельскай і гарадской сям'і як структурны прынцып будовы калектыўнай манаграфіі 90-га года прымусіў даследчыкаў двойчы разглядаць тыпы і структуру сям'і, шлюб і ўнутрысямейныя адносіны. Аўтары 5-га тома серыі «Беларусы» 2001 г. вырашылі гэту задачу ў гістарычнай рэтраспекцыі шляхам паралельнага аналізу элементаў структуры сям'і, сямейнай абраднасці ў сялян і гараджан, а таксама прадстаўнікоў розных сацыяльных слаёў грамадства (простага люду, мяшчан, рамеснікаў, шляхты і інш.).

Сямейнае (народнае па паходжанні) выхаванне як падмурак прафесійнай педагогікі – новы напрамак даследавання сям'і этнолагамі. Дынаміка сістэмы роднасці і сваяцтва прааналізавана не толькі на падставе этналагічных, фальклорных, але і мовазнаўчых даследаванняў [4, с. 147–164].

Акрамя аналізу традыцыйнай сямейнай абраднасці беларусаў (канца XIX – пачатку XX стст.), у манаграфіі 1990 г. («Сям'я і сямейны быт беларусаў») прадстаўлена вывучэнне сучаснага стану сямейнай абраднасці на падставе этнасацыялагічнага даследавання 1986 г. Т. І. Кухаронак вылучыла этапы развіцця сямейнай абраднасці ў БССР з улікам ступені распаўсюджання трох формаў яе бытавання (грамадзянскія, народна-бытавыя і царкоўныя), інтэнсіўнасці іх пранікнення ў быт, характарам суіснавання і ўзаемадзеяння [3, с. 189–249].

Радзінныя звычаі і абрады прааналізаваны ў сувязі з паходжаннем, структурай, распаўсюджанасцю, трансфармацыйнымі зменамі, сучасным станам іх бытавання. Выхад на ўзровень сімволікі і знакавай сістэмы сведчыць пра здольнасць даследчыцы прадставіць сямейную абраднасць як нацыянальную мадэль, заснаваную на ўзаемадзеянні абрадавых кодаў.

Новымі ў параўнанні з манаграфіяй 1990 г. з'яўляюцца аспекты тэмы, прысвечаныя даследаванню звычаяў і абрадаў, звязаных з будаўніцтвам і засяленнем хаты, провадамі на службу ў войска, а таксама звычаяў і абрадаў, што суправаджалі развод мужа і жонкі.

Адметна, што пяты том серыі «Беларусы» змяшчае больш за 70 адзінак ілюстрацый і з'яўляецца найбольш поўным наглядным выданнем за ўвесь час існавання айчыннай школы, што даследуе праблему сям'і беларусаў.

Перабудовачная эпоха і пераход Беларусі да рынкавых адносін адбіліся на ідэалагічным фоне прац па сям'і. Традыцыя матывацыі актуальнасці абранай даследчыкамі тэмы пастаўленымі задачамі партыі змянілася на пастаноўку праблем відавочнай дысфункцыянальнасці асобных аспектаў жыццядзейнасці мікраасяродку.

Сям’я як сацыяльны інстытут і як малая група разглядалася даследчыкамі сістэмна. Таму невыпадкова, што такі падыход даў магчымасць узняцца да аналізу ўзаемаўплыву характару шлюбу (сям’і) на ход этнічных працэсаў у краіне, прадуцыраваць новую ў параўнанні з папярэднімі перыядамі навуковую задачу прагназавання наступстваў развіцця зафіксаваных тэндэнцый у жыццядзейнасці сям’і, а выкарыстанне міждысцыплінарнага падыходу не толькі ўзбагаціла змест прадмета, але і акрэсліла «цалінныя» галіны ў тэматычных і метадалагічных кірунках грамадскіх дысцыплін.

Прапанаванае раней усходнеславянскае гісторыка-параўнальнае асвятленне асобных элементаў абраднасці захавалася і на сучасным этапе гістарыяграфіі. Пераемнасць гэтай традыцыі хутчэй за ўсё звязана з удалым метадам выўлення спецыфікі ўласнабеларускай мадэлі.

Комплекснае вывучэнне савецкай сямейнай абраднасці адносна шырокім выкарыстаннем анкетнага метаду аналізу «жыццяздольнасці» грамадзянскіх наватвораў, а таксама выяўленнем формаў бытавання сямейнай абраднасці ў вёсцы і горадзе. Найбольш плённым у метадалагічным плане, на нашу думку, з’яўляецца сучасны перыяд з дыферэнцыяваным падыходам да вывучэння прадмета даследавання. Тут праглядаюцца спробы рэтраспектыўнага аналізу матэрыялу канца XIX–пачатку XX стст., а таксама вывучэнне сучаснага стану бытавання прадмета. Прычым калі гістарычная рэтраспекцыя адметная ўключэннем статыстычных звестак сумежных дысцыплін для вырашэння ўласнаэтнаграфічнай задачы, то вывучэнне сучаснага стану – шырокім выкарыстаннем звестак экспедыцый, прадстаўленнем картаграфавання фактalogіі па духоўнай культуры беларусаў. Развіццё тэхнічных сродкаў дало магчымасць ілюстраваць распрацоўку па праблеме сям’і схемамі, фотаздымкамі, шырэй выкарыстоўваць камп’ютарныя тэхналогіі падчас апрацоўкі «лічбавай» фактalogіі асобных аспектаў жыццядзейнасці сямейнага мікраасяродку.

Апытанне студэнтаў факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта выявіла істотны недахоп агульных ведаў пра даследчыкаў беларускай сям’і, а знаёмства з гэтай тэмай выклікала здзіўленне глыбінёй яе распрацоўкі. Гэта сведчыць пра вялікую дыстанцыю паміж крыніцай інфармацыі і яе патэнцыйным спажыўцом. Значнай перашкодай у плане даступнасці гэтай навуковай інфармацыі з’яўляецца яе фармат: для атрымання ведаў неабходна знайсці бібліяграфічную спасылку і наведаць бібліятэку. Такі працэс займае больш часу ў параўнанні з праходжаннем анлайн-курса або праглядам папулярнага відэа. Акрамя гэтага, акадэмічная мова можа ўскладніць успрыманне інфармацыі студэнтамі і спецыялістамі з іншых галін

навукі, якія цікавяцца гісторыяй беларускай сям'і і традыцыямі сямейных стасункаў, у тым ліку для пашырэння агульнага кругагляду. Для ўключэння матэрыялу па гістарыяграфіі сям'і ў навучальны працэс фармальныя працэдуры змены вучэбных праграм або распрацоўкі спецыяльных курсаў могуць быць замененыя размяшчэннем адпаведнага курса на адной з адукацыйных платформ.

Такім чынам, медыятызацыя навуковых ведаў уключае ў сябе, па-першае, перапрацоўку формы інфармацыі (з акадэмічнага да навукова-папулярнага тэксту), а па-другое, змену яе фармату ад друкаванага да электроннага (у выглядзе анлайн-курсаў, навучальных відэа і інш.). Гэта дазволіць скараціць адлегласць паміж даследчыкам і спажыўцом навуковых ведаў, паспрыяе іх папулярызацыі як у асяроддзі даследчыкаў і студэнтаў, так і ва ўсім грамадстве.

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Hepp A.* Deep Mediatization. London, New York : Routledge. 2020.
2. *Hjarvard S.* The mediatization of society: A theory of the media as agents of social and cultural change // Nordicom Review. 2008. Vol. 29. Issue 2. Pp. 105–134.
3. Сям'я і сямейны быт беларусаў / пад рэд. В. К. Бандарчыка. Мінск : Навука і тэхніка, 1990. 256 с.
4. Беларусы: Гіст.-этнагр. дaслед. / рэдкал. : В. К. Бандарчык, Г. М. Курыловіч, М. Ф. Піліпенка. Мінск : Навука і тэхніка. Т. 5 : Сям'я, 2001. 375 с.